Сяргей НОВІКАЎ

# ЛЕТНІЯ БАІ 1941 г. НА БЕЛАРУСІ ў мемуарах Г.Гудэрыяна і дзённіку баявых дзеянняў 2-й танкавай групы: спроба кампаратыўнага аналізу

*Як вядома, адна і тая ж гістарычная падзея можа па-рознаму адлюстроўвацца ў крыніцах. Для таго, каб падысці да яе найбольш аб'ектыўна, неабходна праводзіць параўнальны аналіз звестак крыніц з мэтай скласці як мага больш поўную карціну гістарычнай рэчаіснасці.*

У наш час любую гістарычную крыніцу неабходна вывучаць, абапіраючыся на сучаснае вучэнне аб інфармацыі, у рамках якога асаблівае значэнне набывае крытычны аналіз з мэтай выяўлення навукова верагоднай інфармацыі. У сваім даследаванні мы зыходзім з тэзіса, што ў метадалогіі навуковага пазнання выдзяляюцца тры тыпы фактаў: *факты гістарычнай рэчаіснасці, факты гістарычнай крыніцы* і *навукова-гістарычныя факты*[1]. Першыя з іх, факты гістарычнай рэчаіснасці, з'яўляюцца адназначнымі і нязменнымі. Другія — факты гістарычнай крыніцы — з'яўляюцца апісаннем рэальных падзей, зробленым непасрэдным стваральнікам гістарычнай крыніцы. Безумоўна, што такое адлюстраванне ў пэўнай ступені суб'ектыўнае. Трэція факты — навукова-гістарычныя — з'яўляюцца сродкам перадачы фактаў мінулага на аснове гістарычнай крыніцы. Усведамленне навуковай верагоднасці фактаў кожнай з гэтых катэгорый неабходна разглядаць у якасці абавязковай умовы для аб'ектыўнага пазнання гістарычнай рэчаіснасці. Заўважым, што ў прыведзены пералік фактаў не ўключаны тыя, якія складаюць аснову прац такога жанру, як асабістыя ўспаміны. Высвятленне прыроды паходжання фактаў у такой літаратуры неабходна праводзіць зыходзячы з даследчыцкай задачы па выяўленні ступені іх дакладнасці і паўнаты.

Асабліва важна гэта рабіць у дачыненні да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Часам працы аб баявых дзеяннях у першыя месяцы вайны пабудаваныя на не зусім навукова верагодных фактах, цытаванні не столькі арыгінальных дакументаў, колькі ўспамінаў удзельнікаў падзей. Звернемся да канкрэтнага прыкладу і разгледзім ход баявога супрацьстаяння на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. у адлюстраванні, з аднаго боку, **дзённіка баявых дзеянняў 2-й нямецкай танкавай групы** (далей — 2-й ТГр), выяўленага аўтарам артыкула ў Федэральным ваенным архіве Германіі ў Фрайбургу летам 2011 г., а з другога — **успамінаў генерал-палкоўніка Г.Гудэрыяна** (камандуючага 2-й ТГр), занатаваных ім праз 10 га-



***НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч.***
*Загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Радзіца Крупскага раёна Мінскай вобласці, у 1980 г. закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны і крыніцазнаўства. Аўтар манаграфій "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004), "Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў" (Мн., 2014), каля 300 навуковых публікацый. З'яўляецца сурэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць" (Вып. 1—12, Мн., 2002—2014).*

оў пасля тых падзей у кнізе "Воспоминания солда-а"[2]. Апошнія і сёння лічацца *"ўнікальным дакумен-ам эпохі"*, *"каштоўнай крыніцай інфармацыі"*, *"лю-тэркам вайны танкаў"*, а вытрымкі з іх прыводзяцца якасці бясспрэчных фактаў. Заўважым, аднак, што а гэтага часу ніхто не вызначаў ступень верагоднасці гістарычнай інфармацыі ў гэтых успамінах, адэкват-асці адлюстравання баявых падзей і, самае галоў-ае, аб'ектыўнасць ацэнак тых гістарычных падзей.

У прадмове да кнігі "Воспоминания солдата" Г.Гудэрыян разважае аб важнасці асабістых успамі-аў непасрэдных удзельнікаў вайны, нават калі гэ-ыя ўспаміны асвятляюць толькі асобныя эпізоды і osяць суб'ектыўны характар. Ён піша, што гістарыч-на праўдзіваму асвятленню мінулых падзей больш за ўсё перашкаджае недастатковасць крыніц, паколькі многія дакументы былі знішчаны альбо трапілі ў рукі праціўніка[3]. І сапраўды, значная частка дакументаў вермахта ў канцы вайны была вывезена саюзнікамі СССР па антыгітлераўскай кааліцыі на тэрыторыю Вя-лікабрытаніі і ЗША, дзе знаходзілася да канца 1950 — пачатку 1960-х гг.[4].

Адразу заўважым, што кожная з указаных крыніц набліжае даследчыка да стварэння агульнай карціны гістарычных падзей, паказвае яе асобныя элементы, утрымлівае канкрэтныя звесткі аб ходзе баявых дзе-янняў у Беларусі летам 1941 г. Без сінтэзу такіх дэта-ляў немагчыма напісаць аб'ектыўную карціну баявых дзеянняў у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны. Але адразу ж зададзімся пытаннем, наколькі ж поўнымі ў сэнсе захавання гістарычных фактаў з'яўляюцца прыведзеныя вышэй успаміны, да якіх даволі часта звяртаюцца айчынныя гісторыкі як да асабліва важ-най крыніцы гістарычнай інфармацыі[5].

Прапанаваная спроба навуковага аналізу рэаль-ных баявых дзеянняў і іх наступстваў на тэрыторыі Бе-ларусі летам 1941 г. праводзіцца метадам кампара-тыўнага аналізу фактаў успамінаў і фактаў дакумен-тальнай крыніцы.

Успаміны Г.Гудэрыяна ахопліваюць значную коль-касць падзей у даволі шырокіх храналагічных рамках. Аўтар кнігі апісвае галоўныя, на яго погляд, моманты літаральна кожнага дня вайны, пачынаючы з 22 чэр-веня 1941 г. Звернемся да двух першых падраздзе-лаў кнігі, дзе паказаны баявыя аперацыі, праведзе-ныя часцямі 2-й ТГр на тэрыторыі Беларусі ў час ру-ху ад заходняй граніцы СССР да Дняпра. Практычна кожны дзень з трох тыдняў паказаны аўтарам успамі-наў скрозь прызму галоўных падзей. У кнізе даецца пэўная характарыстыка ходу баявых дзеянняў, пры-водзяцца іх вынікі, згадваецца пра месца дыслакацыі і напрамкі перамяшчэння вайсковых часцей. Пры гэ-тым, аднак, кідаецца ў вочы, што ў дачыненні да не-каторых дзён практычна немагчыма скласці агульную карціну як ходу баявых дзеянняў, так і характару са-мых важных падзей дня. Звернем асаблівую ўвагу на тры дні — 3, 8 і 9 ліпеня 1941 г., пра якія ва ўспамінах пакінуты самыя кароткія запісы. Два першыя адроз-ніваліся ад папярэдніх тым, што іх падзеі перадаваліся ў кнізе літаральна адным сказам ці двума-трыма радкамі. Пра трэці дзень Гудэрыян пакінуў большы па памерах запіс, аднак ён не ўтрымліваў вычарпальнай інфармацыі аб баявых дзеяннях на ўсіх участках на-ступлення 2-й ТГр.

Адразу ж узнікае пытанне: чаму аўтар кнігі абы-ходзіў маўчаннем гэтыя даты, не ў поўнай меры асвят-ляў баявыя падзеі на тэрыторыі Беларусі і па-за яе межамі? Пераканаўчы адказ мы знаходзім у прад-мове да кнігі, у якой аўтар сцвярджае, што, для та-го каб вычарпальна расказаць аб усіх падзеях вай-ны, патрэбны адпаведныя матэрыялы. Іх адсутнасць ці недастатковасць моцна перашкаджае гістарычна праўдзіваму асвятленню падзей[6]. Апроч таго, падзеі, асветленыя ў кнізе, выкладзены так, як яны ў свой час уяўляліся камандзіру 2-й ТГр. Матэрыяламі для кнігі паслужылі асобныя звесткі, атрыманыя ад яго былых саслужыўцаў. Таму Г.Гудэрыян адзначае, што ва ўс-памінах не выключаны асобныя прабелы ў дачынен-ні да некаторых падзей, а ўзнаўленне іх з'яўляецца вельмі складанай справай пасля некалькіх гадоў зна-ходжання ў амерыканскім палоне[7].

Нагадаем, што ў адпаведнасці з планам "ма-ланкавай вайны" на тэрыторыю СССР наступалі тры групы армій — "Поўнач", "Цэнтр" і "Поўдзень". Праз тэрыторыю Беларусі праходзіў фронт наступлення групы армій "Цэнтр" пад камандаваннем фельдмар-шала Ф.фон Бока. У якасці ключавой ставілася зада-ча праравацьабарону савецкіх войскаў, акружыць іх і ліквідаваць. Рухомыя танкавыя групы павінны бы-лі пранікнуць углыб тэрыторыі, каб перашкодзіць стварэнню новых абарончых рубяжоў. Як адзначаў Г.Гудэрыян, напрамак галоўнага ўдару для яго тан-кавых часцей спачатку не быў вызначаны[8]. Кожная з трох армейскіх груп мела прыкладна аднолькавыя сілы, хоць у склад групы армій "Цэнтр" уваходзілі дзве танкавыя групы (2-я пад камандаваннем генерал-палкоўніка Г.Гудэрыяна і 3-я пад камандаваннем ге-нерал-палкоўніка Г.Гота), тады як у склад армейскіх груп "Поўдзень" і "Поўнач" — толькі па адной. Пер-шую аператыўную цэль для сваёй групы у распача-тай кампаніі камандуючы 2-й ТГр бачыў у дасягненні раёна Смаленска, Ельні, Раслаўля[9].

У складзе 2-й танкавай групы былі задзейніча-ныя баявыя часці трох танкавых карпусоў: 24-га (3-я і 4-я танкавыя дывізіі, 10-я матарызаваная і 1-я кава-лерыйская дывізіі), 46-га (10-я танкавая дывізія, ма-тарызаваная дывізія СС "Рэйх" і пяхотны полк "Вя-лікая Германія") і 47-га (17-я і 18-я танкавыя і 29-я матарызаваная дывізіі). 24-ы корпус дзейнічаў на правым флангу і вёў наступленне ў напрамку Пінска і Кобрына. У цэнтры ў складзе 4-й нямецкай палявой арміі наступаў 12-ы армейскі корпус, які павінен быў акружыць Брэст і ўзяць крэпасць, а таксама ачысціць мясцовасць паміж 24-м і 47-м танкавымі карпусамі. На левым флангу вялі наступленне 17-я і 18-я танка-выя дывізіі 47-га корпуса ў напрамку на Пружаны — Слонім[10]. Сілы 46-га танкавага корпуса знаходзіліся ў рэзерве і рухаліся на левым флангу танкавай гру-пы за 47-м танкавым корпусам.

Паводле ўспамінаў Г.Гудэрыяна, па стане на 2 ліпеня 1941 г. часці танкавай групы размяшчаліся: 1-я кавалерыйская дывізія — на поўдзень ад Слуцка, 3-я танкавая дывізія — у Бабруйску (перадавы атрад дывізіі стаяў пад Рагачовам), 4-я танкавая дывізія — у Свіслачы, 10-я матарызаваная дывізія — на ўсход ад Слуцка; дывізія СС "Рэйх" — на поўнач ад Балусевічаў на Бярэзіне, 10-я танкавая дывізія — у Чэрвені, пяхотны полк "Вялікая Германія" — на поўнач ад Баранавічаў; 18-я танкавая дывізія — у Барысаве, 17-я танкавая дывізія — у Койданаве, 29-я матарызаваная дывізія — у Стоўбцах, 5-ы кулямётны батальён — на паўднёвы ўсход ад Баранавічаў.

Апісанню падзей наступнага дня, **3 ліпеня**, Г.Гудэрыян прысвячае ва ўспамінах літаральна пару радкоў наступнага зместу: *"Рускія войскі, акружаныя пад Беластокам, капітулявалі. Цяпер усю сваю ўвагу я сканцэнтраваў на руху ў напрамку да Дняпра"*[11]. Згадак пра іншыя падзеі таго дня ва ўспамінах няма.

Звернемся ў рамках кампаратыўнага аналізу да дакументальнай крыніцы — дзённіка баявых дзеянняў 2-й танкавай групы[12], у якім адлюстраванню падзей гэтага дня на тэрыторыі Беларусі прысвечана 8 лістоў. З тэксту можна даведацца пра тое, што надвор'е было сухім спякотным, убачыць баявую абстаноўку і дзеянні часцей 24-га, 46-га і 47-га танкавых карпусоў.

Вельмі важным у справе пошуку адказу на пытанне, чаму няма разгорнутага запісу аб гэтым дні ва ўспамінах Г.Гудэрыяна, трэба лічыць першы запіс у дзённіку за 3 ліпеня. Там занатавана, што ў 00.00 гадзін камандаванне над 2-й і 3-й танкавымі групамі перайшло да камандуючага 4-й новастворанай танкавай арміяй генерал-фельдмаршала Г. фон Клюге, які на той момант узначальваў 4-ю палявую армію групы армій "Цэнтр". Яго камандны пункт размясціўся ў Баранавічах. Гэтая інфармацыя з'явілася для Гудэрыяна пэўным ударам, выклікала псіхалагічны шок па той прычыне, што камандуючы губляў свабоду ў прыняцці рашэнняў без узгаднення з вышэйшым камандаваннем.

У дзённіку баявых дзеянняў баявыя падзеі занатаваныя, пачынаючы з 6 гадзін раніцы і да 22.50. З ранішніх запісаў вынікае агульнае становішча трох карпусоў. На лініі дзейнасці 24-га танкавага корпуса найбольш актыўныя баявыя дзеянні вяліся на ўчастку наступлення 1-й кавалерыйскай дывізіі, якая адбівала рашучыя ўдары савецкіх войскаў у раёне Слуцка. 10-я матарызаваная дывізія (якая ў складзе 46-га танкавага корпуса вяла баі за авалоданне перадмаставым плацдармам у Беразіно) паведамляла аб ударах савецкіх часцей з выкарыстаннем артылерыі. У той жа час 47-ы танкавы корпус паведамляў аб адсутнасці адметных падзей[13]. Акрамя гэтага ў дзённіку занатавана інфармацыя, якая вынікае з ліста камандуючага групай армій "Цэнтр" Ф. фон Бока на адрас 2-й танкавай групы. Згадваецца аб неабходнасці неадкладна эвакуяваць у тыл палонных чырвонаармейцаў. Таксама паведамляецца пра тое, што запыт Г.Гудэрыяна аб накіраванні дэсантнікаў разам з неабходнай тэхнікай для фарсіравання Дняпра задаволены не будзе.

А 9-й гадзіне раніцы на камандны пункт танкавай групы прыбыў прадстаўнік аператыўнага аддзела новастворанай 4-й танкавай арміі, каб узгадніць пытанне адносна аддачы каманд і вырашэння бягучых задач па баявым, транспартным і харчовым забеспячэнні падпарадкаваных часцей. У дзённіку адзначаецца, што некаторыя з прапанаваных рашэнняў выклікалі рашучае непрыняцце і былі катэгарычна адхіленыя Г.Гудэрыянам, асабліва прапанова аб стварэнні спецыяльнага рэзерву на аснове выкарыстання дзвюх матарызаваных дывізій са складу 2-й і 3-й танкавых груп. Г.Гудэрыян цвёрда выказаўся, што ў ходзе правядзення рашучага наступлення на Маскву з мэтай вырашэння галоўнай аператыўнай задачы на ўсходзе было б надзвычай шкодным трымаць рухомыя баявыя часці ў якасці рэзерваў, паколькі гэта значна аслабляе моц наступальнага ўдару[14].

Раніцай, перад ад'ездам у Барысаў, Г.Гудэрыян аддаў распараджэнне даслаць радыёграмы камандзірам 3-й і 4-й танкавых дывізій з прапановай злучыць сілы ў раёне Чачавіц, з тым каб правесці моцны аб'яднаны ўдар паабапал Старога Быхава з мэтай забеспячэння паспяховага фарсіравання Дняпра. У 9.45 якраз з такой прапановай да камандуючага звяртаецца камандзір 24-га танкавага корпуса, пераканаоы ў неабходнасці абысці ўмацаваныя плацдармы савецкай абароны, якія могуць быць у раёне Рагачова ці Магілёва.

У 11.20 паступіла данясенне аператыўнага аддзела штаба 47-га танкавага корпуса, з якога вынікала, што камандзір 17-й танкавай дывізіі не атрымаў аддадзены яшчэ 2 ліпеня праз радыёсувязь загад не пакідаць лініі баявых дзеянняў корпуса ў раёне Стоўбцаў, а рухацца ў напрамку на паўночны ўсход па шашы на Маскву толькі пасля яе замены 29-й пяхотнай дывізіяй. Як высветлілася, асобныя часці 17-й дывізіі насуперак загаду Г.Гудэрыяна ўжо выйшлі на марш. Забягаючы наперад, адзначым, што ў данясенні 47-га танкавага корпуса аб маршы і баявых дзеяннях на ўчастку баявога рэйду з Барысава ў Коханава зафіксаваны факт удзелу ў баях пад Сянно ўзмоцненага танкавага палка пад камандаваннем палкоўніка Ліхта, на шляху руху якога было знішчана больш за 250 танкаў 5-га савецкага механізаванага корпуса (з іх прыкладна 150 пры дапамозе авіяцыі)[15].

У поўдзень аператыўны аддзел штаба 2-й танкавай групы данёс камандуючаму групай армій "Цэнтр" Ф. фон Боку удакладненыя лічбы аб узятых трафеях і панесеных стратах па стане на 1 ліпеня 1941 г.: у палон былі ўзяты 21 790 чырвонаармейцаў (яшчэ амаль 24 тыс. забіты), захоплены 817 танкаў і 347 гармат. Уласныя страты 2-й танкавай групы былі наступныя — 931 чалавек забіты, 2451 паранены і 272 зніклі без вестак[16].

З данясенняў, якія паступілі ў аператыўны штаб 2-й ТГр па стане на 18.00, вынікала наступная сіту-

ацыя: 24-ы танкавы корпус (камандны пункт — Баб-руйск) — з 17-й гадзіны 3-я танкавая дывізія вяла пра-рыў цераз Друць у напрамку на Рагачоў (35-ы тан-кавы полк 4-й танкавай дывізіі таксама бярэ ў гэтым ўдзел, пачаў свае выступленне а 14-й гадзіне з Баб-руйска на Чачавіцы). Данясенняў ад 1-й кавалерый-скай і 10-й пяхотнай дывізій не паступала. Аб стано-вішчы падраздзяленняў 46-га танкавага корпуса (ка-мандны пункт у Чэрвені) вядома з данясенняў дывізіі СС "Рэйх" і 10-й танкавай дывізіі. Першая дасягнула рубяжоў Якшыцы і Брадзец, дзе намерана стварыць умацаваны плацдарм; другая (без 4-й танкавай бры-гады) трапіла пад моцны артылерыйскі агонь каля Бе-разіно, дзе дагараў мост цераз раку. Акрамя таго, пе-радавыя танкавыя падраздзяленні 46-га корпуса за-бяспечвалі далейшае наступленне ў раёне Чэрвеня і Беразіно (тады як асноўныя сілы працягвалі акру-жэнне савецкіх часцей каля Капыля).

Становішча танкавых і пяхотных дывізій 47-га корпуса (камандны пункт у Смалявічах) вызначалася на той момант наступным чынам: 18-я танкавая ды-візія, якая мела загад наступаць на Оршу, пашыры-ла свой плацдарм на ўсход ад Барысава і наблізілася да Лошніцы; 17-я танкавая дывізія, з аднаго боку, вы-конвала задачу не дапусціць прарыву акружаных са-вецкіх войскаў, а з другога — знаходзілася ў баявым рэйдзе з мэтай аховы мастоў у Барысаве. 4-я танка-вая брыгада выконвала ахоўныя задачы на поўдзень ад Койданава[17].

А 18-й гадзіне, пасля вяртання з дзённай паездкі ў раён пераправаў каля Барысава (месца размяшчэння 18-й танкавай дывізіі) на камандны пункт 47-га кор-пуса, камандуючы 2-й танкавай групай Г.Гудэрыян узяў удзел у перамовах у штабе сваёй групы з гене-рал-фельдмаршалам Г. фон Клюге і генерал-пал-коўнікам Г.Готам. Пасля рапарта аб сітуацыі часцей 2-й ТГр ён выказаўся адносна пытанняў, пастаўленых камандуючым 4-й танкавай арміяй. У прыватнасці, Г.Гудэрыян заўважыў, што: 1) ён выконвае загад аб дасягненні сваімі рухомымі часцямі раёна Смаленс-ка, з тым каб быў адкрыты шлях на Маскву, аднача-сова яго часці ўдзельнічаюць у завяршэнні ліквіда-цыі катла ў раёне на паўднёвы захад ад Мінска; 2) у інтарэсах дасягнення аператыўнай цэлі на ўсход-зе неабходна як мага хутчэй вызваліць усе часці 2-й танкавай групы, пакуль задзейнічаныя на ліквідацыі катла; 3) у выпадку вываду часцей для ўзброенага за-беспячэння участка, замацаванага за 2-й ТГр, трэба задзейнічаць адну з ахоўных дывізій; 4) неабходна адмовіцца ад адсоўвання баявога рубяжа катла да-лей на захад, паколькі для гэтага будуць патрэбныя каля трох пяхотных дывізій, якіх на гэты момант ня-ма; 5) наяўная сетка дарог робіць рубеж наступлен-ня 2-й танкавай групы занадта выцягнутым. Завяр-шыў сваё выступленне Г.Гудэрыян наступнымі сло-вамі: *"У любым выпадку настане час, калі неабходна будзе канцэнтраваць сілы ў адной з самых важных кропак для нанясення галоўнага ўдару"*[18]. Яго пазі-цыю ў дачыненні да хутчэйшага вываду моцных рухо-мых часцей з ахоўнай лініі катла падтрымаў каманду-ючы 3-й танкавай групай Г.Гот, які дадаў, што пакуль назіраецца адступленне праціўніка са сваіх ліній аба-роны на ўсход. Завяршылася размова двума распа-раджэннямі камандуючага 4-й танкавай арміяй Г.фон Клюге. У адпаведнасці з першым дазваляўся вывад з баявых дзеянняў 4-й танкавай брыгады з мэтай яе далейшага баявога выкарыстання, у адпаведнасці з другім — забаранялася запланаванае раней пра-вядзенне баявых дзеянняў узмоцненай групай 17-й танкавай дывізіі[19].

У 20.30 камандзір 47-га танкавага корпуса атры-маў загад стварыць ударную баявую групу пад ка-мандаваннем палкоўніка Ліхта ў складзе палка пры-крыцця з адным артылерыйскім дывізіёнам і адным танкавым батальёнам. Гэтая баявая група падпарад-коўвалася непасрэдна танкавай групе і павінна бы-ла рыхтавацца да выкарыстання ў баявых дзеяннях у раёне катла на паўднёвы захад ад Мінска.

Заключны запіс у дзённіку баявых дзеянняў быў зроблены ў 22.50. У ім паказана становішча баявых часцей 2-й ТГр, а таксама згадваюцца факты пра аба-рончыя баі Чырвонай арміі па стане на канец 3 ліпе-ня. У прыватнасці, адзначана, што на ўсходнім фрон-це працягваюцца баі з праціўнікам, які аказвае ўпар-тае супраціўленне. На фронце 2-й танкавай групы на працягу дня давялося адбіваць контратакі савец-кіх часцей у раёнах Беразіно, Барысава і Стоўбцаў.

Такім чынам, дзень **3 ліпеня 1941 г.** быў насыча-ны падзеямі самага рознага кшталту, пра што свед-чаць запісы ў дзённіку баявых дзеянняў, які скру-пулёзна вёў аператыўны штаб 2-й танкавай групы. Кожная нямецкая танкавая і пяхотная часць была за-нятая вырашэннем канкрэтных аператыўных задач, звязаных з забеспячэннем далейшага прасоўвання вермахта на ўсход. Аднак па незразумелых да кан-ца прычынах гэтыя падзеі былі пакінуты каманду-ючым 2-й ТГр па-за ўвагай і не знайшлі адлюстраван-ня ў мемуарах.

Звернемся да падзей **8 ліпеня** і прасочым, як яны адлюстраваны ва ўспамінах Г.Гудэрыяна і ў дзённіку баявых дзеянняў аператыўнага аддзела штаба 2-й ТГр[20]. Так, у кнізе мемуараў усе падзеі гэтага дня пе-рададзеныя наступным сказам: *"8 ліпеня я наведаў 46-ы танкавы корпус; дывізія СС "Рэйх", якая ўвахо-дзіла ў яго склад, працягвала весці баі на заходнім беразе Дняпра"*[21].

З дзённіка баявых дзеянняў вынікае, што каманд-ны пункт па-ранейшаму знаходзіўся ў Нова-Бары-саве. У якасці асноўнага выніку дня вызначана пе-рагрупоўка сіл і правядзенне баявых дзеянняў па захопе прасторы для падрыхтоўкі наступлення це-раз Днепр[22].

Пачынаецца данясенне даволі важнымі звесткамі з загаду камандуючага групай армій "Цэнтр" Ф. фон Бока, у якім прыведзеныя вынікі завяршэння шмат-дзённых бітваў у раёнах Беластока і Мінска. Паводле нямецкіх даных, на гэтым участку фронту часцям вер-махта давялося весці баі з чатырма савецкімі арміямі

ў складзе 32 стралковых, 8 танкавых і 3 кавалерыйскіх дывізій, а таксама 6 матарызаваных брыгад. З іх былі разбітыя 22 стралковыя, 7 танкавых і 3 кавалерыйскія дывізіі, а таксама 6 матарызаваных брыгад. У палон узятыя 287 704 савецкіх салдата. Сярод трафеяў апынулася 2585 танкаў, 1449 гармат, 246 самалётаў. У загадзе канстатавалася, што баі прыйшлося весці супраць моцнага праціўніка, які бесперапынна і ўпарта абараняўся, прычым да апошняга салдата[23].

У 4.40 паступіла тэлеграма ад камандуючага групай армій "Цэнтр", у якой 2-й ТГр (разам з ахоўнымі падраздзяленнямі 2-й палявой арміі) загадвалася стварыць у раёне Абольцаў баявы заслон для паўночнага флангу танкавай групы. Па стане на 6.00 гадзін было ўдакладнена агульнае становішча часцей 24-га, 46-га і 47-га танкавых карпусоў. 1-я кавалерыйская дывізія займала ахоўны рубеж на паўднёвы захад ад Рагачова, 3-я танкавая дывізія знаходзілася на рубяжы Жлобін — Рагачоў; часці 46-га корпуса занялiся аднаўленнем разбураных мастоў; перадавыя часці 18-й танкавай дывізіі 47-га корпуса вялі баі ў раёне на паўночны захад ад Коханава, тады як асноўная частка дывізіі была размешчаная ў раёне Крупкі — Талачын. 17-я танкавая дывізія была падзеленая на тры групы. Першая знаходзілася ў Талачыне, другая (у складзе стралковага батальёна, аднаго танкавага батальёна і аднаго артылерыйскага дывізіёна, а таксама сапёраў і падраздзялення па знішчэнні танкаў) трапіла ў акружэнне ў раёне Сянно, трэцяя знаходзілася за 17 км ад Чарэі. Пры гэтым 17-я танкавая дывізія планавала нанесці ўдар адной з груп на поўдзень у раёне Сянно, другой групай — з Талачына на паўночны ўсход, з тым каб абедзве групы выйшлі ў раён Абольцаў. Г.Гудэрыян лічыў немэтазгодным выкананне гэтых планаў, аднак асаблівую занепакоенасць выклікала ў яго ў першую чаргу моцная рассеянасць дывізіі і падзел яе на тры асобныя баявыя групы.

У 8.20 паступіў загад Г.Гудэрыяна камандзіру 47-га танкавага корпуса аб тым, каб 17-я танкавая дывізія выходзіла з-пад Сянно і тэрмінова далучалася да 18-й танкавай дывізіі ў раёне Коханава. Праз 25 хвілін Г.Гудэрыян у час тэлефоннай размовы з камандзірам 47-га танкавага корпуса пацвердзіў яго і аддаў распараджэнне выводзіць 17-ю танкавую дывізію з баявых дзеянняў пад Сянно і далучаць яе да 18-й танкавай дывізіі з мэтай збірання і засяроджвання ўсіх танкавых часцей. У гэты ж час афіцэр штаба 24-га танкавага корпуса даставіў трафейную карту, верагоднасць якой была пацверджаная савецкімі ваеннапалоннымі, нумары часцей якіх фігуравалі на дакуменце, а таксама данёс камандуючаму інфармацыю камандзіра корпуса Гайера. Той прыйшоў да высновы, што канцэнтрацыя моцных савецкіх сіл вакол Рагачова і Жлобіна, а таксама знаходжанне іншых ударных груповак у раёне Гомеля і Нова-Зыбкава з'яўляюцца сведчаннем намераў праціўніка контрнаступаць у напрамку паўднёвага флангу танкавай групы. На думку камандзіра корпуса, для выканання аператыўнай задачы па паспяховым фарсіраванні Дняпра і стварэння неабходнага плацдарма трэба было б увесці ў бой не менш за дзве пяхотныя дывізіі, тады як сярод часцей корпуса на гэтым рубяжы найбольш баяздольнымі былі 3-я танкавая і 1-я кавалерыйская дывізіі. Камандзір 24-га танкавага корпуса сумняваўся ў дастатковасці гэтых сіл для стрымлівання прарыву праціўніка. Для выканання задачы патрабавалася ўзмацненне флангу корпуса не менш чым адной танкавай і адной матарызаванай дывізіямі. Гэта было магчыма шляхам уступлення ў баі ў раёне Бабруйска дзвюх пяхотных дывізій, канчатковае прыбыццё якіх у раён баявых дзеянняў патрабуе пэўнага часу. У мерах перасцярогі было прапанавана тэрмінова перамясціць падраздзяленні 10-й матарызаванай дывізіі з левага флангу на паўднёвы (правы) фланг корпуса[24].

Як вынікае з дакумента, галоўную думку камандзіра 24-га танкавага корпуса Гайера Г.Гудэрыян не палічыў слушнай, асабліва меркаванне аб намеры савецкіх войскаў нанесці контрудар на заходнім беразе Дняпра ў раёне Жлобіна і Рагачова. Камандуючы 2-й танкавай групай вызначыў напрамкам для ўдару з мэтай фарсіравання Дняпра раён Старога Быхава. У поўдзень ён зноў вярнуўся да гэтага пытання і прыняў рашэнне адтэрмінаваць наступленне на адзін дзень, паколькі прыбыццё пяхотных часцей 2-й палявой арміі спазнялася. Таму ў штаб 4-й танкавай арміі было адпраўлена данясенне аб пераносе наступлення для 24-га танкавага корпуса на тэрмін не раней за 10 ліпеня, а для 36-га і 37-га танкавых карпусоў — не раней за 11 ліпеня[25].

У 13.15 камандуючы аддаў загад аб фарміраванні баявой групы пад камандаваннем палкоўніка Узінгера з часцей 2-й палявой рэзервовай арміі і 9-га армейскага корпуса 4-й палявой арміі. Месцам яе фарміравання быў вызначаны раён паміж Барысавам і Начай, адкуль у другой палове дня 8 ліпеня група перамясцілася ў раён Чарэі, каб забяспечыць ахову паўночнага фланга 2-й танкавай групы. З паведамлення камандзіра баявой групы вынікала, што ён пачне выкананне пастаўленай задачы толькі пасля 17.00.

А 15-й гадзіне Г.Гудэрыян выехаў у размяшчэнне 46-га танкавага корпуса.

Паводле данясенняў, па стане на 17.00 склалася наступная сітуацыя: перадавыя атрады 53-га армейскага корпуса пачалі прыбываць у Бабруйск, дзе адразу ж прыступілі да аховы тылавых раёнаў 24-га танкавага корпуса ў раёне Бабруйска. 46-му танкаваму корпусу ўдалося паступова прасунуцца на паўднёвы захад ад Шклова. 18-я танкавая дывізія 47-га танкавага корпуса вяла баі на поўнач і паўднёвы ўсход ад Талачына, аднак савецкія войскі ўпарта абаранялі свае пазіцыі. У такой сітуацыі камандзір дывізіі аддаў загад нанесці ўдар у напрамку на Коханава. Баявая група 17-й танкавай дывізіі разам з камандзірам дывізіі ў сярэдзіне дня была акружаная ў раёне на паўночны ўсход ад Чарэі. Для яе дэблакіроўкі накіравалі танкавы батальён з раёна Сянно. Таксама для дэблакіроўкі пачалі выкарыстоўваць сілы авіяцыі.

У 18.50 паступіла прапанова камандуючага 3-й ТГр Г.Гота адносна 17-й танкавай дывізіі, згодна з якой яна павінна была застацца ў раёне Сянно для прыкрыцця паўднёвага флангу 7-й танкавай дывізіі. Аднак камандуючы 2-й ТГр Г.Гудэрыян рашуча адхіліў гэтую прапанову, паколькі планаваў, што 17-я танкавая дывізія сярод іншых часцей у хуткім часе будзе ўдзельнічаць у наступленні цераз Днепр.

Канчатковае становішча часцей 2-й ТГр 8 ліпеня было пазначана па стане на 23.30. 24-ы танкавы корпус (камандны пункт якога знаходзіўся ў раёне Чачавіц) завяршаў перагрупоўку сіл з мэтай далейшага наступлення цераз Днепр: 1-я кавалерыйская дывізія рыхтавалася да аховы флангаў у раёне Дняпра — Бярэзіны на паўднёвы ўсход ад Бабруйска; 3-я танкавая дывізія займала абарончую пазіцыю паміж Жлобінам і Новым Быхавам; 4-я танкавая дывізія займала зыходную пазіцыю каля Старога Быхава; 10-я матарызаваная дывізія выходзіла на пазіцыю на поўдзень ад Дашкоўкі. 46-ы танкавы корпус (камандны пункт якога знаходзіўся ў раёне Беразіно) з баямі прасоўваўся наперад, сустракаючы ўпартае супраціўленне савецкіх войскаў. Пры гэтым 10-я танкавая дывізія трымалася на захад ад шашы Магілёў — Шклоў; дывізія СС "Рэйх" з узмоцненым палком "Германія" знаходзілася каля разбуранага моста на Друці, тады як яе асноўныя сілы займалі раён за 24 км на захад ад Бялынічаў; пяхотны полк "Вялікая Германія" выходзіў у раён Беразіно. 47-ы танкавы корпус (камандны пункт знаходзіўся пад Крупкамі) вымушаны быў стрымліваць танкавыя контрудары з удзелам моцных сілаў савецкіх танкаў (да трох танкавых дывізій). Пры гэтым 18-я танкавая дывізія вяла ўпартыя баі ў раёне Коханава (5 км на поўнач і 7 км на захад); 17-я танкавая дывізія знаходзілася ў раёне Сянно — Ліпавічы (17 км ад Сянно) і планавала прабівацца ў раён Коханава для злучэння з сіламі 18-й танкавай дывізіі. У дзённіку таксама паведамлялася, што ў напрамку на Чарэю выступіла 12-я танкавая дывізія са складу 3-й ТГр для ўзяцця Сянно. 29-я матарызаваная дывізія 47-га танкавага корпуса пачала канцэнтравацца каля Начы. Баявыя групы Штрайха і Узінгера выконвалі свае задачы па зборы ў раёне Начы і на ўсход ад Барысава[26].

Такім чынам, ва ўспамінах Гудэрыяна дзень 8 ліпеня знайшоў толькі схематычнае адлюстраванне, тады як у дзённіку баявых дзеянняў паказана, што насамрэч у гэты дзень на фронце наступлення 2-й ТГр адбываліся розныя падзеі, назіралася актыўнае перамяшчэнне баявых часцей у напрамку да Дняпра.

Толькі ў 4.15 **9 ліпеня** Г.Гудэрыян вярнуўся з паездкі ў 46-ы танкавы корпус, пасля чаго выказаў свае меркаванні адносна далейшых дзеянняў. Ён адзначыў, што вырашэнне пастаўленых баявых задач патрабуе значна большых намаганняў. Сітуацыю ўскладняе і доўгае знаходжанне без аператыўнай наступальнай дзейнасці баявых рухомых часцей на знешніх рубяжах катла пад Мінскам. Калі б гэтыя часці знаходзіліся ў кожным з танкавых карпусоў, то сіла наступлення была б большай і часці маглі б фарсіраваць Днепр амаль на тры дні раней. Гэта, у сваю чаргу, не дазволіла б праціўніку падцягнуць тыя баявыя часці, якія на дадзены момант эфектыўна выкарыстоўваюцца супраць танкавых карпусоў. Урэшце Г.Гудэрыян прыйшоў да высновы, што чым раней будзе праведзена наступленне цераз савецкія пазіцыі на Дняпры, тым верагодней яго поспех, паколькі кожны страчаны дзень вядзе да ўзмацнення праціўніка. Таму, нягледзячы ні на якія цяжкасці, неабходна прытрымлівацца прынятага раней рашэння аб прарыве пазіцый савецкіх войскаў на Дняпры на працягу бліжэйшых двух дзён — 10 і 11 ліпеня. Гэтую задачу маглі б вырашыць дзве-тры дывізіі 24-га ці 47-га танкавых карпусоў нават ва ўмовах, калі на флангах адбываюцца контрнаступленні савецкіх войскаў у раёне Віцебска/Оршы і Рагачова[27].

Такое меркаванне Г.Гудэрыяну давялося рашуча адстойваць днём 9 ліпеня перад камандуючым 4-й танкавай арміяй фельдмаршалам Г.фон Клюге, які патрабаваў неадкладнага спынення аперацыі. "Бурнай" сустрэчы прысвечана амаль палова старонкі ўспамінаў Гудэрыяна[28], пры гэтым пакінутыя без увагі іншыя, стратэгічна важныя падзеі дня, калі часці 3-й ТГр даносілі камандуючаму групы армій "Цэнтр" аб занятцi Віцебска. Апошняя вестка нават не згаданая ва ўспамінах, тады як у дзённіку баявых дзеянняў адлюстраваная з дакладнасцю да хвіліны[29].

9 ліпеня камандны пункт 2-й танкавай групы яшчэ знаходзіўся ў Нова-Барысаве. На працягу гэтага дня танкавая група прадаўжала перагрупоўваць сілы і вяла баі за выхад на зыходныя пазіцыі для правядзення наступлення цераз абарончы рубеж на лініі Дняпра[30]. Галоўная задача дня для 2-й ТГр вынікала з загаду, які ў 1.50 паступіў па тэлеграфнай сувязі ад камандуючага 4-й танкавай арміяй Г.фон Клюге. Левы фланг 2-й ТГр павінен быў спыніць спробы савецкіх войскаў прарвацца на захад паміж Коханава і Сянно, пры гэтым 2-я і 3-я танкавыя групы павінны былі забяспечыць узаемадзеянне паміж унутранымі флангамі груп.

На 6.00 агульнае становішча баявых часцей было наступнае: 24-ы і 46-ы карпусы дабіліся істотных зменаў у папярэдні дзень, за выключэннем 10-й танкавай дывізіі, перадавыя часці якой дасягнулі лініі Дняпра ў раёне вёскі Дабрэйка (10 км на поўдзень ад Шклова); з баявых часцей 47-га корпуса найбольш напружаным было становішча 17-й танкавай дывізіі, якая пачала пакідаць раён Сянно і прасунулася ў напрамку на Коханава. У 8.50 паступіла радыёграма ад 3-й ТГр з паведамленнем, што асноўныя сілы 17-й дывізіі павінны былі затрымацца пад Сянно да падыходу туды 12-й танкавай дывізіі. Праз паўгадзіны, калі камандзір 47-га танкавага корпуса далажыў аб аператыўным становішчы, Г.Гудэрыян аддаў загад аб пераводзе 29-й матарызаванай дывізіі на поўдзень ад стратэгічнай трасы № 2 (танкавая дарога праз Барысаў, Оршу і Смаленск на Маскву)[31]. Пры гэтым ён загадаў спыніць выкарыстанне тактыкі слабых удараў у месцах наступлення.

У 9.35 камандзір 46-га танкавага корпуса звярнуўся з просьбай ліквідаваць (з выкарыстаннем авіяцыі) пантонны мост, узведзены савецкімі войскамі ў 500 м на поўнач ад Шклова. Праз паўгадзіны быў аддадзены загад 24-му танкаваму корпусу аб вывадзе ў ноч з 9 на 10 ліпеня 3-й танкавай дывізіі з раёна Бабруйска і падрыхтоўцы яе да выступлення ў напрамку на Стары Быхаў. У 11.15 камандуючы 2-й ТГр Г.Гудэрыян адбыў у месца знаходжання 47-га танкавага корпуса і 18-й танкавай дывізіі. Праз гадзіну ў яго прысутнасці камандзір 47-га танкавага корпуса аддаў загад 18-й танкавай дывізіі аб тым, каб група Штрайха разам з часцямі дывізіі не займала раён на паўночны ўсход ад Коханава. Пры гэтым Г.Гудэрыян аддаў свой загад, згодна з якім 18-й дывізіі было неабходна заняць гэты раён, а баявой групе Штрайха затым забяспечыць яго ахову. Камандуючы падкрэсліваў, што пазіцыі павінны быць узятыя, нягледзячы ні на якія абставіны, каб 11 ліпеня магло адбыцца наступленне цераз Днепр[32]. У дзённіку прыводзіцца згадка, якая сведчыць, што праз тры гадзіны раён на паўночны ўсход быў заняты групай Штрайха, але той не хапала ўласных сілаў для забеспячэння неабходнай аховы. У той жа час камандуючы 2-й ТГр настойліва патрабаваў, каб 18-я танкавая і 29-я матарызаваная дывізіі своечасова дасягнулі зыходных пазіцый для наступлення.

А 13-й гадзіне на камандным пункце былі атрыманыя дырэктывы камандуючага групай армій "Цэнтр" Ф.фон Бока адносна тактыкі наступлення цераз Днепр і правядзення аператыўнага ўдару ў раёне на ўсход ад Смаленска. 24-ы танкавы корпус павінен быў пачаць наступленне на поўнач ад Старога Быхава а 16-й гадзіне 10 ліпеня сіламі 4-й танкавай і 10-й матарызаванай дывізій. 3-й танкавай дывізіі загадвалася пакінуць раён на паўночны ўсход ад Бабруйска (яна была на замене сіламі 1-й кавалерыйскай дывізіі ў ноч з 9 на 10 ліпеня) і знаходзіцца ў гатоўнасці за першым эшалонам баявога парадку. Пасля ўдалага фарсіравання Дняпра і захопу невялікага плацдарму перад 24-м корпусам ставілася задача па пашырэнні плацдарму на поўдні Магілёва. Корпус павінен быў неадкладна выставіць ачапленне на поўдзень ад горада, выйсці асноўнымі сіламі на шашу Рагачоў — Масква і пачаць наступаць у напрамку Раслаўля і Калугі. Акрамя таго перад корпусам ставілася задача па забеспячэнні аховы паўднёвага фланга групы[33].

Згодна з дырэктыўнымі ўказаннямі, камандуючы 2-й ТГр Г.Гудэрыян аддаў загад, з якога вынікала, што 46-ы і 47-ы танкавыя карпусы пачынаюць наступленне раніцай 11 ліпеня. Першы павінен фарсіраваць Днепр на поўдзень ад Шклова і нанесці ўдар цераз Расну і Горкі ў напрамку на раён вакол Ельні. Другі павінен злучыць усе свае сілы пад Копыссю і пасля захопу плацдарму нанесці ўдар у напрамку на Ляды, займаючы пры гэтым з усходу плацдарм Оршы. Далей, пры прасоўванні паўздоўж Дняпра, ён павінен быў захапіць Смаленск і нанесці ўдар у раён Дарагабужа. Ахову левага фланга забяспечвалі групы Штрайха і Узінгера. Апошняя павінна была рухацца па шашы Талачын — Галоўчын да пераправы на поўдзень ад Круглага, прыводзячы ў парадак разбураныя масты, рыхтуючы на іх месцах пераправы для тэхнікі грузападымальнасцю да 8 т. З гэтага моманту яна перайшла ў падпарадкаванне 47-га танкавага палка.

У 15.15 з 24-га танкавага корпуса прыйшло паведамленне аб недахопе боезапасаў з просьбай даставіць іх да пачатку наступлення. Г.Гудэрыян адразу ж аддаў указанне аб абавязковым удзеле 24-га корпуса ў наступленні, нягледзячы на цяжкасці з боезапасамі. У гэты ж час прыйшло аналагічнае паведамленне ад 46-га корпуса ў дачыненні да дывізіі СС "Рэйх". Аднак камандуючы не адмяніў свой загад аб правядзенні наступлення нават у такіх умовах. А 16-й гадзіне Г.Гудэрыян звярнуўся да камандуючага 4-й танкавай арміяй з просьбай даставіць боезапасы (у першую чаргу снарады для цяжкіх палявых гаўбіц і цяжкое пяхотнае ўзбраенне) у раён Бабруйска, выкарыстоўваючы для гэтага рэзервы 2-й палявой арміі. У 18.45 на кантрольны запыт прыйшло паведамленне ад галоўнага кватармайстра 2-й палявой арміі аб своечасовай пастаўцы боезапасаў[34].

З іншых дзённых паведамленняў варта адзначыць радыёграму камандуючага Г.Гудэрыяна, якая была аддадзеная праз 15 хвілін пасля яго вяртання на камандны пункт з паездкі ў размяшчэнне 47-га танкавага корпуса і тычылася пераносу тэрміну наступлення 24-га танкавага корпуса з 16.00 на 5.00 наступнага дня[35]. У гэты ж час паступіла паведамленне са штаба 4-й танкавай арміі аб пераносе каманднага пункта з раніцы наступнага дня ў Нова-Барысаў.

Заключную частку запісаў за 9 ліпеня ў дзённіку баявых дзеянняў займаюць звесткі аб палажэнні баявых часцей напрыканцы дня. Разгледзім гэтае размяшчэнне з улікам адлюстравання ва ўспамінах і дакументах *(гл. табліцу)*. З табліцы вынікае, што ў дзённіку прыведзены больш падрабязныя звесткі, на падставе якіх можна лакалізаваць на мясцовасці дакладныя пункты размяшчэння баявых часцей. Таму даследчыкам важна абапірацца менавіта на дакумент.

План 2-й танкавай групы на 10 ліпеня быў наступны: 24-ы танкавы корпус пачынае наступленне а 5-й гадзіне раніцы пры моцнай падтрымцы сіл авіяцыі; 46-ы і 47-ы танкавыя карпусы займуць зыходныя пазіцыі для наступлення, якое пачнецца раніцай 11 ліпеня[36].

Такім чынам, параўнальнае даследаванне адлюстравання баявых падзей у мемуарнай літаратуры і дакументальнай крыніцы дэманструе адсутнасць ва ўспамінах камандуючага 2-й ТГр цэлага шэрагу як агульных, так і спецыфічных звестак, якія падрабязна занатаваныя ў дзённіку баявых дзеянняў. Зварот да гістарычных фактаў, адлюстраваных у ім, не толькі дазваляе выявіць пэўныя лакуны ва ўспамінах Г.Гудэрыяна, але значна паглыбляе нашы веды аб баявых дзеяннях на абарончым рубяжы войскаў Чырвонай арміі. Адсутнасць пэўных звестак ва ўс-

*Табліца*

**Размяшчэнне нямецкіх часцей 2-й танкавай групы (на 9 ліпеня 1941 г.)***

| Нумар часці | Успаміны Г.Гудэрыяна | Дзённік баявых дзеянняў 2-й танкавай групы |
|---|---|---|
| Камандны пункт 2-й ТГр | Барысаў | Нова-Барысаў |
| КП 24-га танкавага корпуса | — | Чачавіцы |
| 1-я кавалерыйская дывізія | паўднёвы ўсход ад Бабруйска | правы фланг 2-й ТГр паміж Бярэзінай і Дняпром |
| 3-я танкавая дывізія | Жлобін — Рагачоў — Новы Быхаў | Жлобін — Рагачоў |
| 4-я танкавая дывізія | Стары Быхаў | паўночны захад ад Старога Быхава |
| 10-я матарызаваная дывізія | Стары Быхаў | у раёне на поўдзень ад Дашкоўкі |
| КП 46-га танкавага корпуса | — | Бялынічы |
| 10-я танкавая дывізія | на поўдзень ад Шклова | на поўдзень і захад ад Шклова |
| Дывізія СС "Рэйх" | Паўлава, на поўдзень ад Магілёва | Шапялевічы |
| Полк "Вялікая Германія" | каля Бялынічаў | на поўнач ад 10-й танкавай дывізіі |
| КП 47-га танкавага корпуса | — | Крупкі |
| 18-я танкавая дывізія | на поўдзень ад Талачына | шаша Коханава — Орша, вакзал Коханава, на поўдзень ад Тумінічаў |
| 17-я танкавая дывізія | раён Замосця | Сянно — Абольцы — Нямойта — Коханава |
| 29-я матарызаваная дывізія | паўднёвы захад ад Талачына | займае пазіцыі ў раёне Стараселля для наступлення на Копысь |

*Табліца складзеная паводле даных: Гудериан Г. Воспоминания солдата. М., 2012. С. 192; BA-MA. RH 21-2/927: Darstellung der Ereignisse am 9.7.1941. Bl. 177-178.

памінах сведчыць аб наяўнасці прычын, якія не дазволілі аўтару кнігі паказаць баявыя дзеянні ў поўным аб'ёме. Гэтыя прычыны нам невядомыя, што яшчэ раз сведчыць аб важнасці крытычнага стаўлення да зместу любых успамінаў, незалежна ад іх аўтарскай прыналежнасці. Зварот да некаторых з іх, што пацвярджае наш прыклад, сведчыць аб *"наяўнасці абстрактных уяўленняў у дачыненні да аператыўных і тактычных падзей вайны"*[37]. Як вынікае з нашага даследавання, настаў час, калі патрэбна выкарыстоўваць выключна навукова верагодныя факты, не толькі правераныя, але і не раз пераправераныя і, галоўнае, доказаныя на аснове як шырокага кола розных дакументальных крыніц, так і адпаведных даследчых метадаў.

Напрыканцы хацелася б зазначыць, што атрыманне рэальных гістарычных ведаў неабходна ў сувязі з захаваннем у беларускай ваеннай гістарыяграфіі белых плямаў па гісторыі баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі не толькі летам 1941 г., але і падчас вызвалення Чырвонай арміяй беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на завяршальным этапе Вялікай Айчыннай вайны.

[1] Ковальченко И.Д. Методы исторического исследования. М., 1987. С. 130. Методологические проблемы истории / В.Н.Сидорцов [и др.]; под общ. ред. В.Н.Сидорцова. Мн., 2006. С. 170.

[2] Гудериан Г. Воспоминания солдата. М., 2012.

[3] Там жа. С. 3.

[4] Новікаў С.Я. "Александрыйскія мікрафільмы" як новая архіўная першакрыніца ваеннай гісторыі Беларусі // Вести института современных знаний. 2000, № 2. С. 62.

[5] Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945 / А.А.Коваленя (руководитель авторского коллектива), А.М.Литвин, В.И.Кузьменко [и др.]. Мн., 2005. С. 80; Беларусь. 1941—1945: Подвиг. Трагедия. Память. В 2 кн. Кн. 1 / редкол.:. А.А.Коваленя (пред.) [и др.]. Мн., 2010. С. 38; 1941 год: Страна в огне: В 2 кн. Кн. 1. Очерки. М., 2011. С. 305.

[6] Гудериан Г. Воспоминания солдата. С. 8, 10.

[7] Hürter J. Hitlers Heerführer. Die deutsche Oberbefehlshaber im Krieg gegen die Sowjetunion 1941/42. München, 2006. S. 629.

[8] Гудериан Г. Воспоминания солдата. С. 165.

[9] Там жа. С. 181.

[10] Там жа. С. 168-169.

[11] Там жа. С. 186.

[12] Федэральны ваенны архіў Германіі (далей BA-MA): BA-MA. RH 21-2/927: Kriegstagebuch der Panzer Gruppe 2 — KTB Pz. Gr. 2. Bl. 114—121.

[13] BA-MA. RH 21-2/927: Darstellung der Ereignisse am 3.7.1941. Bl. 114.

[14] Ibidem.

[15] BA-MA. RH 24-47/5: Anlage Nr. 248 zum KTB Nr. 2 des XXXXVII. Pz. Korps: Bericht über Marsch und Kampf der 17. Pz. Division von Borissow über Senno nach Kochanowo v. 11.7.41. Bl. 6.

[16] BA-MA. RH 21-2/927: Darstellung der Ereignisse am 3.7.1941. Bl. 117.

[17] Ibidem. Bl. 117-118.

[18] Ibidem. Bl. 119.

[19] Ibidem. Bl. 120.

[20] BA-MA. RH 21-2/927: Darstellung der Ereignisse am 8.7.1941. Bl. 159—168.

[21] Гудериан Г. Воспоминания солдата. С. 191.

[22] BA-MA. RH 21-2/927: Darstellung der Ereignisse am 8.7.1941. Bl. 159.

[23] Ibidem. Bl. 159.

[24] Ibidem. Bl. 162.

[25] Ibidem. Bl. 163.

[26] Ibidem. Bl. 166-167.

[27] Ibidem. Bl. 167-168.

[28] Гудериан Г. Воспоминания солдата. С. 191-192.

[29] BA-MA. RH 21-2/927: Darstellung der Ereignisse am 9.7.1941. Bl. 171—178.

[30] Ibidem. Bl. 171.

[31] Загад камандуючага тылавым раёнам групы армій "Цэнтр" аб абазначэнні трас ад 17.7.41 г. // Новікаў С.Я. Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў. Мн., 2014. С. 244.

[32] BA-MA. RH 21-2/927: Darstellung der Ereignisse am 9.7.1941. Bl. 174.

[33] Ibidem.

[34] Ibidem. Bl. 176.

[35] Ibidem. Bl. 177.

[36] Ibidem. Bl. 178.

[37] Wegner B. Erschriebene Siege. Franz Halder, die "Historical Division" und die Rekonstruktion des Zweiten Weltkrieges im Geiste des deutschen Generalstabes // Politischer Wandel, organisierte Gewalt und nationale Sicherheit. Beiträge zur neueren Geschichte Deutschlands und Frankreichs / hrsg. von Ernst Willi Hansen, Gerhard Schreiber und Bernd Wegner. München, 1995. S. 302.